subject one. There are monothematic and polythematic aphorisms. During the study on the ground of analysis of selected aphorisms a detailed algorithm of automatic system for thematic classification of English aphorisms was developed

Ключевые слова: афоризм, афористические высказывания, тематика, автоматическая тематическая классификация

Афоризмы и афористические высказывания живут в нашем языке с незапамятных времён. До сих пор не существует точного и общепринятого определения самого термина «афоризм».

Проведенный нами анализ показал, что наиболее распространенной классификацией англоязычных афоризмов в печатных изданиях и Интернет-ресурсах является тематическая классификация, при которой афоризмы делятся по темам, которые раскрываются в том или ином афоризме за счет использования отдельных слов или словосочетаний.

Тематики могут быть достаточно узкими, представленными лишь одним понятием (например, Success, Beauty и т.д.) или охватывающими более широкие темы, включающие в себя несколько понятий (например, Life and Death). Более широкие тематики охватывают афоризмы, объединенные на основании смежности тем, например Art and Literature, или наоборот полной их противоположности и противопоставлению друг другу, например War and Peace.

Для анализа нами было отобрано 230 текстов англоязычных афоризмов. Афористические единицы были разделены на монотематические, раскрывающие только одну тематику (*Success is often achieved by those who don`t know that failure is inevitable. Coco Chanel*. Theme: Success), и политематические, представляющие несколько, порой противоречивых тематик (*Anyone who stops learning is old, whether at 20 or 80. Anyone who keeps learning stays young. The greatest thing in life is to keep your mind young. Henry Ford.* Themes: Education, Old, Youth).

Все монотематические афористические единицы были разделены на пять групп на основании тематической принадлежности афоризмов: *Education, Success, Happiness, Fashion, Beauty*. Тематики были выделены на основании тематических классификаций афоризмов на специализированных Интернет-порталах www.aphorismsgalore.com, www.aphorism4all.com. Наиболее многочисленная группа из отобранных афористических высказываний – Education (32%).

Все проанализированные афористические единицы, относящиеся к политематическим, были разделены на три группы в соответствие с количеством представленных в них тематик. Наиболее многочисленной группой в результате анализа оказалась группа афоризмов, которые можно отнести к двум тематикам – 71% от всех политематических афоризмов. Например, *Love isn`t there to make us happy. I believe it exists to show us how much we can endure. Hermann Hesse.* Афоризмы, которые могут быть отнесены к трем тематикам, составили 24% от всех проанализированных политематических афоризмов. Наименьшее количество афоризмов (6%) могут быть отнесены к четырем тематикам.

В ходе последующей работы на основании проведенного тематического анализа отобранных афоризмов, а также с использованием полученных поисковых образов для выделенных тематик был разработан детальный алгоритм автоматической тематической классификации англоязычных афоризмов.

©ГДУ

## МАДЫФІКАЦЫІ ФОРМЫ ДЗЁННІКА Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ

***Г.Ю. НОВІК***, **А.В. БРАДЗІХІНА**

The paper outlines the diary form modifications and specificity of its functioning in the contemporary Belarusian literature, taking into account the multilevel of modern writers' creative self-realization: non-fiction, fiction and blog literature. The conclusions drawn suggest that the causes of dated records modifications are connected with their historical conditioning (evolution) as well as the appearance of new literature tendencies

Ключавыя словы: дзённік, мемуары, аўтабіяграфічная літаратура, дакументальнасць, нон-фікшн, эсэ, блог, сеціратура, фрагментарнасць, постмадэрнізм

Адметнае месца ў аўтабіяграфічнай літаратуры займае дзённік – датаваныя штодзённыя запісы, у якіх адлюстраваны здарэнні з жыцця іх стваральніка або тыя падзеі, сведкам якіх стаў аўтар. Адрозніваючыся ад мемуараў, эпісталярыя, аўтабіяграфій, запісных кніжак, дыярыуш падчас сваёй эвалюцыі зазнаў шэраг мадыфікацый, што закранулі яго фармальна-зместавыя параметры.

Асноўныя ўласцівасці датаваных запісаў абумоўленыя прасторава-часавай арганізацыяй аповеду і спецыфікай выяўлення вобраза аўтара. Да першых адносяцца «падваенне асобы» аўтара, гіпатэтычная незавершанасць, рэфлексійнасць, маналагічнасць, мадыфікацыя сістэм мінулага і будучага часу, прымеркаванасць запісаў да пэўнай даты ці падзеі, іх перыядычнасць, паступальная дынаміка падзей, нерэтраспектыўнасць і звязаная з ёй аператыўнасць, эклектычнасць; да другіх – фрагментарнасць, калажнасць, суб'ектыўнасць. Мемуары і дзённік, як блізкія літаратурныя з'явы, адрозніваюцца рознай ступенню дакументальнасці, кампазіцыяй (цэласнасцю – фрагментарнасцю),

тэмпаральнай арганізацыяй (рэтраспектыўнасцю – інтраспектыўнасцю і строгай храналогіяй), адметнымі ўзроўнямі камунікатыўнасці, а адсюль – шчырасці.

Гісторыя дзённіка хаця і налічвае не адно стагоддзе, з’яўляецца адносна «маладой» у параўнанні з іншымі літаратурнымі формамі і жанрамі. Доўгатэрміновая адсутнасць спрыяльных гістарычна-сацыяльных умоў не магла не паўплываць на спецыфіку і час узнікнення аўтабіяграфічных твораў на беларускіх землях. Агульнапрынятым лічыцца меркаванне, што перадумовай для ўзнікнення дзённікавай формы стала шырокае распаўсюджанне летапісаў і хронік, дзе ўжо ў XVI ст. выявілася тэндэнцыя да «алітаратурвання» храналагічных запісаў. Так, Баркулабаўскі летапіс – датаваная крыніца звестак не толькі пра мястэчка Баркулабава, але і пра мінулае Усходняй Беларусі. Пэўная ступень белетрызацыі гісторыка-дакументальных дзелавых запісаў уласціва і «Хронікі Быхаўца», насычанай ваенна-патрыятычным пафасам і прасякнутай відавочнай антыпольскай скіраванасцю.

Спрыяльнай умовай для далейшага развіцця дыярыушаў стала эпоха рамантызму (канец XVIII – пачатак XIX стст.) з ягонай засяроджанасцю на ўнутраным свеце асобы, яе гарманічных адносінах з прыродай, а таксама на грамадскіх праблемах. Аднак патрэба чалавека ў грунтоўнай самарэфлексіі прывяла да таго, што з сярэдзіны XVIII ст. дыярыушы «ўсё больш выцясняліся ўспамінамі, заснаванымі на рэтраспектыўнай рэляцыі» [1, с. 612]. Тым не менш узнікненне прамежкавага, сінтэтычнага жанру ўспамінаў-дзённікаў не здолела цалкам выцесніць дыярыушы з літаратурнага ўжытку.

Форма дзённіка зазнала росквіт двойчы: на пачатку XX стагоддзя (творы А. Луцкевіча, П. Бадуновай, Ядвігіна Ш. і інш.) і ў 1980 – 1990-я гады (дзённікі І. Шамякіна, В. Адамчыка, Я. Пархуты і інш.), паколькі развіццё датаваных запісаў надоўга было запаволенае праз рэпрэсіі і Вялікую Айчынную вайну. Абодва перыяды адметныя павышанай увагай да пытанняў нацынальнага адраджэння і фармальнай разнастайнасцю дзённікаў (падарожныя дзённікі, дзённікі-творы, дзённікі-хронікі, публіцыстычныя дзённікі). На сучасным этапе дыярыуш існуе ў трох разнавіднасцях – нон-фікшн, мастацкай літаратуры і блогасферы.

Тэрмін «non-fiction» (непрыдуманая літаратура) узнік на Захадзе і напрыканцы XX ст. усё часцей стаў ужывацца ў айчыннай гуманітарнай навуцы. Адзначаючы, што такім творам уласціва перадусім прымеркаванасць да рэальнага факта, дакументальнасць, даследчыкі дагэтуль не сышліся ў меркаваннях наконт іх жанравай сістэмы. М. Местэргазі [2] адносіць да яе дзённік, лісты, мемуары, нататкі, травелог, біяграфію, аўтабіяграфію, а таксама некаторыя нарысы і эсэ. Л. Рублеўская ў якасці разнавіднасцей літаратуры факта называе «дакументальную прозу, дзённікавую прозу, падарожныя нататкі і г. д.» [3, с. 243]. Дзённікі нон-фікшн даволі разнастайныя, што дало падставу для дыферэнцыяцыі. Так, А. Ягораў адрознівае дыярыушы сямейна-бытавыя, дарожныя, грамадска-палітычныя і службовыя. М. Поляк дадае да іх дзённікі літаратурнага жыцця і «творчыя лабараторыі» [4, с. 16]. Варта заўважыць, што сённяшнія дзённікі нон-фікшн значна шырэй згаданых тыпалогій. У беларускай літаратуры факта дамінуюць такія віды дыярыушаў, як грамадска-дзелавы і сацыяльна-бытавы, дзённік творчасці, дзённік літаратурнага жыцця і дзённік сінтэтычнага характару.

Так, дзённікі літаратурнага жыцця «Лісты абляцелыя» А. Жука і «Трагічны дзевяноста шосты», «Год двухтысячны» Н. Гілевіча і грамадска-дзелавыя дзённікі В. Дранчука («Белавежская пушча: рэзалюцыя SOS») і С. Яновіча («Дзённікі») выконваюць пераважна летапісную функцыю, даносяць каларыт гістарычнай эпохі і ролю асобы ў ёй, прычым першыя характарызуюцца большай роляй аналітызму, другія ж – канстатацыяй падзей і рэдукцыяй эмацыянальна-экспрэсіўнага пачатку.

Дыярыушы сінтэтычнага характару, якім уласціва эсэізацыя (як, да прыкладу, «Шпітальнаму дыярыушу» П. Васючэнкі), у большай ступені аўтарэпрэзентатыўныя. Яны ствараюць міф пра аўтара, адсюль іх імкненне да экспрэсіўнасці, лірызму і нязмушанасць стылю. Адметнай рысай для ўсіх дзённікаў такога тыпу, з'яўляецца падпарадкаванасць запісаў агульнай ідэі і яе аргументацыі. Аўтар пры гэтым выступае як носьбіт суб’ектыўных меркаванняў, адсюль эмацыянальнасць і публіцыстычнасць аповеду. Варта адзначыць, што эсэ «дасягае мэты з дапамогай прамога аўтарскага выказвання, для чаго не патрабуецца стварэння ні выдуманых герояў, ні фальшывых падзей, ні выбудаванага сюжэта» [5, с. 23].

Дзённік творчасці скіраваны на грунтоўнае раскрыццё ўнутранага свету асобы аўтара праз спробы яго творчай самарэалізацыі. Тут пісьменнік, як правіла, разважае пра механізм крэатыўнага пачатку, змяшчае ўрыўкі ці накіды ўласных тэкстаў, удасканальвае сваё майстэрства за кошт шліфоўкі вобразаў, пераасэнсавання думак і работы над словам. Яскравым прыкладам такога дыярыуша з’яўляюцца «Трынаццаць дзён з дзённіка Антона Кудлатага», якія належаць аўтарству вядомага паэта і публіцыста Анатоля Кудласевіча.

Сацыяльна-бытавым дзённікам уласціва акцэнтацыя ўвагі аўтара на падзеях вузкАасабістага зместу – сямейным жыцці, сяброўскіх адносінах, рэфлексіях на фоне прыроды і г. д. Аўтар тут стварае перадусім уяўленне пра сябе як пра чалавека, а не творцу. Гэтая акалічнасць элімінуе падабенства сацыяльна-бытавога дзённіка і дзённіка творчасці, заснаванае на адэкватнай суаднесенасці ступеняў даверальнасці ў запісах. Дзённік Кастуся Цвіркі «Дні мае, падарункі» ў поўнай ступені адпавядае такому азначэнню.

Можна адзначыць, што хранатопу ў дзённіках нон-фікшн належыць жанраўтваральная роля. Так, дыярыушам з моцным выяўленчым пачаткам (як у С. Яновіча, В. Дранчука, К. Цвіркі, П. Васючэнкі) уласціва наяўнасць кантынуальнага хранатопу, падпарадкаваны душэўным рытмам стваральніка дзённік А. Кудласевіча характарызуецца псіхалагічным часам-абсягам, у той час як датаваныя запісы, дзе адлюстравана грамадская дзейнасць аўтара (творы А. Жука і Н. Гілевіча), маюць лакальны дыскрэтны час.

Сярод асноўных разнавіднасцей дзённіка сваімі адметнасцямі вылучаюцца дыярыушы, арганічна ўплеценыя ў канву мастацкага твора ці стылізаваныя пад яго. Праз такія датаваныя запісы, стварэнне якіх належыць пэўнаму персанажу, пісьменнік імкнецца адлюстраваць працэс унутранага сталення апошняга, яго псіхалагічны стан і матывацыю ўчынкаў. Так, дзённікі Пятра Шапятовіча (пенталогія І. Шамякіна «Трывожнае шчасце») з'яўляюцца сведчаннем яго духоўнага росту і ўзмужання. Небяспечныя ўмовы, у якіх апынуўся герой, у значнай ступені загартоўваюць яго дух і ўплываюць на светапогляд. Часам увага акцэнтуецца і на супярэчнасцях у грамадстве, дачыненне да якіх мае персанаж. Напрыклад, герой А. Мрыя («Запіскі Самсона Самасуя») на працягу твора маральна не эвалюцыянуе і не зазнае зменаў свядомасці. Невычарпальная і бяздумная энергія Самсона разварушвае правінцыйны соцыум, дзякуючы чаму перад чытачом паўстае ўвесь спектр заганаў грамадства першай трэці XX стагоддзя.

У канцы XX – пач. XXI стст. у дзённіках літаратурных персанажаў назіраецца адыход ад аўтабіяграфізму, абумоўлены перадусім зместам датаваных запісаў, герой якіх існуе ў адрозных ад аўтарскіх гістарычных умовах. Акрамя гэтага, сучасныя дыярыушы ў складзе мАстацкага тэксту адметныя кантамінацыяй элементаў розных жанраў і параўнальна большай распаўсюджанасцю, чым у літаратуры папярэдніх эпох. Аўтарская пазіцыя ў дзённіках апасродкаваная праз прызму пачуццяў і дзеянняў персанажа. Такая мастацкая мадэль, калі герою рамана ці аповесці даецца магчымасць самастойна пісаць твор і ў сваю чаргу адчуваць сябе і аўтарам, і чытачом, адпавядае тэорыі ператварэння суб'екта ў тэкст. Паколькі, паводле заснавальніка дэканструктывізму Ж. Дэрыда, «пазатэкставай рэальнасці ўвогуле не існуе» [6, с. 313], то палоннікам тэксту з'яўляецца і індывід, спалучаючы ў сабе адначасова рысы Аўтара, Чытача і Героя. Адсюль – маналагізм у форме дзённіка.

Адрозненне між нон-фікшн і мастацкім дзённікам не абмяжоўваецца неадпаведнасцю ступеняў аўтабіяграфізму ў іх. Паколькі другі тып дыярыушаў уключае ў сябе падзеі, цалкам залежныя ад аўтарскай фантазіі, то роля хранатопу ў дзённіках герояў паслабляецца, ён больш не з'яўляецца цэнтральнай формаўтваральнай катэгорыяй. Да таго ж абсягава-часавай арганізацыі мастацкіх твораў уласціва наяўнасць паслядоўнай сюжэтнай лініі (нягледзячы на элементы рэтраспектыўнасці), у той час як дзённікі нон-фікшн, як правіла, характарызуе фрагментарнасць. Давяраючы свайму герою вядзенне датаваных нататак, аўтар супрацьпастаўляе яго соцыуму. Напрыклад, сацыяльна арыентаваным аповесцям Ю. Станкевіча («Лавец святла поўні», «Апладненне ёлупа») і раману-антыўтопіі В. Гігевіча («Карабель») уласціва адлюстраванне трагізму чалавечай існасці. Дзённікі галоўных герояў выконваюць прагнастычную функцыю, выступаюць своеасаблівым папярэджаннем пра магчымыя памылкі чалавецтва, а таксама падаюць прыклады спробаў іх выпраўлення. Прыхаваны дыдактызм, публіцыстычнае гучанне тэкстаў ураўнаважваюцца менавіта з дапамогай увядзення ў іх структурную арганізацыю формы дзённіка як сродку прамога псіхалагізму.

Асобныя дзённікі, якія з'яўляюцца часткай мастацкага твора, суадносяцца з эстэтыкай постмадэрнізму, які, атрымаўшы шырокую распаўсюджанасць у краінах Еўропы і Амерыкі яшчэ ў другой палове XX стагоддзя, на тэрыторыі нашай краіны таксама займеў вялікую колькасць прыхільнікаў. Акрамя такіх асаблівасцей, як інтэртэкстуальнасць, дэканструкцыя, дэцэнтрызм, пастышызацыя, эклектычнасць, мазаічнасць і калаж, «смерць суб'екта», эпатаж, шматузроўневасць, постмадэрнісцкаму тэксту ўласцівы набор сродкаў (стылістычная множнасць, наяўнасць спасылак, іронія, каментары), дзякуючы якім твор набывае выгляд ready-made. Падобная «паўфабрыкатнасць», паводле Э. Усоўскай, з'яўляецца «следствам спробаў постмадэрнізму сцерці межы між мастацтвам і рэчаіснасцю» [7, с. 186]. Акрэсленая адметнасць яскрава выявілася ў раманах І. Бабкова «Адам Клакоцкі і ягоныя цені» і С. Балаханава «Імя грушы».

Не менш выразна выяўляецца сёння заканамерная тэндэнцыя «дзённікаў персанажаў» да эсэізацыі. Разам з аголенасцю выражэння пачуццяў у такіх творах заўважаецца ўзмацненне эмацыянальнасці, суб'ектыўнасці, лірычнасці, публіцыстычнасці і захоўваецца ўласцівая эсэізаваным дзённікам нон-фікшн наяўнасць структураванай ідэі, якая аб'ядноўвае вакол сябе ўвесь комплекс разваг. Грунтоўна ўзбагачаецца вобразна-сімвалічная сістэма, часам ТЭКсты нават перанасычаны тропамі, што даволі незвычайна для формы дыярыуша. Найбольш яскрава эсэізацыя дзённіка героя выявілася ў кнізе Л. Дранько-Майсюка «Стомленасць Парыжам».

Калі ў кнізе Л. Дранько-Майсюка міжжанравая форма эсэ займае дамінуючую пазіцыю, падпарадкоўваючы сваёй стылістыцы дзённікавыя нататкі, то раман А. Аркуша «Палімпсест» на стылёвым узроўні ўяўляе сабой сінтэз элементаў рознаскіраваных літаратурных накірункаў і жанраў. Як сведчыць сам пісьменнік, раман падпарадкаваны эстэтыцы пострамантызму.

Новае аблічча дзённік набывае ў пачатку XXI стагоддзя, калі, дзякуючы развіццю тэхналогій, ён увасабляецца ў электронным фармаце. Дэмакратычнасць Сеціва, яго ананімнасць, інтэрактыўнасць паспрыялі рэзкаму павелічэнню колькасці дзённікаў, якія сталі весціся на яго абсягах і сваёй сукупнасцю ўтварылі так званую блогасферу. У традыцыйным азначэнні блог уяўляе сабой сайт, што ўтрымлівае тэкставую і/ці мультымедыйную інфармацыю, размешчаную ў адваротным храналагічным парадку і дасяжную для каментавання.

Афармленне і часткова змест сеціўнага дзённіка залежаць ад спецыфікі платформы, на якой ён размешчаны. Так, многія пісьменнікі (С. Балахонаў, У. Лобач, Л. Рублеўская, У. Сцяпан, В. Гапееў, В. Шніп, А. Глобус, М. Южык, А. Казлова і шмат іншых) аддалі перавагу электронным дзённікам на платформе LiveJournal.com. Блогі на гэтым сервісе адметныя агульнай структурай, але некаторыя варыяцыі «дэкору» (колер старонкі, размяшчэнне сайдбара, колькасць калонак і да т. п.) абіраюцца аўтарам. Дзённікі ў межах сайта (LiveInternet.ru, Tut.by і інш.) уяўляюць сабой пераважна падборкі важных для аўтара спасылак у спалучэнні з вузкаасабістай інфармацыяй, часта перанасычанай мультымедыйнымі матэрыяламі. Блогі ж stand-alone (напрыклад, Paplauskaja.net, Labadzenka.by) маюць ярка выражаную інфармАцыйную скіраванасць, і таму зместавай дамінантай у іх з'яўляюцца навіны. Вядзенне віртуальных дзённікаў, размешчаных на асобнай пляцоўцы, патрабуе ад аўтараў ведання мовы html, што тлумачыць іх непапулярнасць. Гэтая ж акалічнасць з'яўляецца адной з прычын нешматлікасці персанальных сайтаў пісьменнікаў, якія прайграюць блогам не столькі праз складанасць тэхнічнай падтрымкі, колькі праз скіраванасць на азнаямленне з творчасцю літаратараў, а не іх асобамі. Блог характарызуецца большай ступенню інтэрактыўнасці паміж аўтарам і чытачом, пра што сведчыць адпаведная колькасць каментароў на ім. Сайт звычайна змяшчае ў сабе інфармацыю пра пэўную творчую асобу – біяграфію, творы, рэцэнзіі і іншыя матэрыялы. Прыкладам могуць служыць сайты В. Гапеева (gapeev.info), С. Балахонава (balachonau.puls.by), У. Арлова (arlou.org) і іншыя.

У сеціратуры пашырылася тэндэнцыя да ўцягвання тэкстаў у гіпертэкстуальныя адносіны, якая выявілася праз рысы нелінейнасці, інтэрактыўнасці, адкрытасці структуры, мультымедыйнасці, стылізацыі, а таксама магчымасці перадруку. Пры гэтым на змену эскапізму, уласціваму традыцыйным дзённікам нон-фікшн, прыйшло актыўнае выкарыстанне сродкаў прыцягнення ўвагі чытацкай аўдыторыі, уключаючы правакацыю і скандал, і абСАлютызавалася самарэпрэзентатыўная функцыя, ператвараючы імя аўтара ў спецыфічны брэнд. Тым не менш паміж блогамі і папяровай літаратурай ёсць судакрананні: як творы апошняй выкладаюцца ў Інтэрнэт, так і фрагменты сеціўных дыярыушаў спарадычна выдаюцца ў фармаце звычайных кніг («Матылі» П. Качатковай, «Ulaslovy» У. Лобача, «Пугачоўскі цырульнік» В. Шніпа і інш.). Як віртуальным, так і традыцыйным дзённікам уласцівыя і такія агульныя рысы, як нерэтраспектыўнасць, фрагментарнасць, датаванасць, перыядычнасць, і іх першапачатковае прызначэнне.

Такім чынам, прычынамі мадыфікацый датаваных запісаў выступаюць як іх гістарычная абумоўленасць (эвалюцыя), так і з'яўленне новых літаратурных тэндэнцый. Устойлівая цікАвасць да формы дзённіка сведчыць пра перспектыўнасць матэрыялу для далейшых даследаванняў.

**Літаратура**


1. Вялікае княства Літоўскае : Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 1 : Абаленскі – Кадэнцыя / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд) і інш. – 2-е выд. – Мінск : БелЭн, 2007. – 688 с.
2. *Местергази, Е. Г.* Литература нон-фикшн/non-fiction / Е. Г. Местергази. – Москва: Совпадение: Университетская книга, 2007. – 325 с.
3. *Рублевская, Л.* Самое главное и всё остальное / Л. Рублевская. – Нёман. – 1998. – №1. – С. 243 – 255.
4. *Поляк, Д. М.* Жанр дневника и проблемы его типологии: автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. филол. наук : 10. 01. 08 / Поляк Д. М. – Алматы, 2004. – 31 с.
5. *Бажок, І.* Эсэ: паэтыка жанру / І. Бажок. – Роднае слова. – 2011. – №11. – С. 22 – 24.
6. *Деррида, Ж.* О грамматологии / Ж. Деррида; [пер. с фр. и вст. ст. Н. Автономовой]. – М.: Ad Marginem, 2000. – 512 с.
7. *Усовская,* Э. Постмодернизм: учеб. пособие / Э. Усовская. – Минск: ТетраСистемс, 2006. – 256 с.